ЦІ МЕСЦА Ў ГОРАДЗЕ «ВЁСЦЫ НАВУКОЎЦАЎ»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Будынкі, што называецца, капітальныя: сцены — больш за паўметра таўшчынёй. Ужо ў тыя гады ў іх была вада, адпаведна, праведзена каналізацыя. Ацяпленне адразу было пячным, але печы не абы-якія — галандскія, з прыгожай кафляй.

На кожным доме па Лошыцкім завулку (менавіта так цяпер называецца колішняя вуліца Мічурына) можна вешаць мемарыяльную шыльду. Тут жыў першы дырэктар інстытута кандыдат сельскагаспадарчых навук Леанід Скрыпнічэнка, член-карэспандэнт АН БССР, арганізатар і першы дырэктар Інстытута абароны раслін, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Антон Амбросаў, дактары навук, прафесары Аркадзь Дзявятаў і Анатоль Волузнеў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Зоя Рамнёва, найслыннейшыя селекцыянеры і агратэхнікі Аркадзь і Эма Сюбаравы, першая ў Беларусі жанчына — Герой Сацыялістычнай Працы Тамара Шкурко і многія іншыя. Нездарма комплекс будынкаў па завулку Лошыцкім, вуліцах Лошыцкай і Юбілейнай атрымаў назву «вёска навукоўцаў» і па рашэнні Мінгарвыканкама з 1992 года ўвайшоў у зону аховы помніка гісторыі і культуры разам з Лошыцкай сядзібай і іншымі будынкамі.

Генадзь Усціновіч адрамантаваў свой дом уласнымі рукамі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Мы будзем працягваць пісаць, таму што хочам тут застацца. Бо важныя нават не самі дамы, а гісторыя і ўнёсак тых людзей, якія тут жылі.

Вядома, час рабіў сваю справу, і дамам навукоўцаў патрабаваўся рамонт. Цяпер некаторыя з іх часткова перабудаваны: у 1990—2000-х давалі дазвол на рэканструкцыю. І гэта адыграла дрэнную ролю ў лёсе пасёлка: летась статус «вёскі навукоўцаў» як гісторыка-культурнай каштоўнасці скасавалі ў сувязі з тым, што архітэктурная задумка квартала ўжо парушана.

У адным з «папярочных» будынкаў жыве Генадзь Усціновіч з сям'ёй. Яго бацька меў непасрэднае дачыненне да будаўніцтва вуліцы.

— У 1999 годзе мы гэта ўсё ўзаконілі, атрымалі тэхпашпарты, афармілі зямлю. Але ў новым генплане напісана, што гэты дом мае больш за 50% зносу. Напэўна, праз тое, што не адрамантавана другая палова. Але гэта рэальна зрабіць, проста людзям не даюць, — расказвае Генадзь.

— Мы баімся ўкласці грошы, бо кожныя пяць гадоў мы на мяжы зносу, — падхоплівае Любоў Гамолка, якая жыве ў такім жа «папярочным» доме насупраць Генадзя.

«Калі сцерці гісторыю, з чым мы застанемся?..»

Падобная гісторыя з пагрозай зносу адбывалася ў 2009 годзе. Тады жыхары распачалі барацьбу за свае сядзібы, пісалі лісты ў дзяржустановы і дамаглі́ся свайго. Аднак, як высветлілася, ненадоўга. Сённяшняя перапіска з адміністрацыяй раёна малапрадуктыўная.

— Мы пісалі зварот наконт двух дамоў па завулку Лошыцкім, а адказ нам далі па двух дамах па завулку Юбілейным. Не разабраўшыся, далі адпіску, — расказваюць суседзі. — Але мы будзем працягваць пісаць, таму што хочам тут застацца. Бо важныя нават не самі дамы, а гісторыя і ўнёсак тых людзей, якія тут жылі. Калі сцерці гісторыю, з чым мы тады застанемся?

Мясцовыя жыхары лічаць, што архітэктары маглі б прыкласці намаганні для рэканструкцыі пасёлка, тым больш што выглядае завулак Лошыцкі даволі акуратна і занядбаным яго дакладна не назавеш. На прысядзібных участках тут вырошчваюць магноліі, абрыкосы, грэцкія арэхі — такія віды раслін сустрэнеш не ў кожным батанічным садзе. Жыхары нават згодныя прывесці ўсе дамы да сучаснага горадабудаўнічага выгляду, абы толькі далі надзею на магчымасць застацца.

Сярод сённяшніх жыхароў «вёскі навукоўцаў» — ужо трэцяе пакаленне вучоных — біёлагаў, кандыдаты навук у галіне хіміі, фізікі, эканомікі, галоўныя інжынеры, праграмісты буйных кампаній, выкладчыкі вядучых ВНУ Мінска, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі БССР, прэмій Прэзідэнта, спецыялісты ў іншых сферах.

Яўген Шамяткоў — сын знакамітых пчалаводаў Міхаіла і Антаніны Шамятковых. Калі некалькі гадоў таму яго маці споўнілася 80 гадоў, у яе гонар ён пасадзіў на ўчастку вінаград. Расліна прынялася, але цяпер аказалася пад пагрозай знішчэння. Памяць аб маці навукоўца — таксама.

«Ты нарадзіў дзіця, а ў цябе яго хочуць забраць»

Разам са зносам прыватнага сектара і далейшай забудовай гэтага лапіка зямлі паўстае экалагічная праблема для наваколля.

— «Белы дом» стаіць на гары. З яго адкрываецца цудоўная перспектыва: унізе — рака, за ёй — балотцы, гэта таксама свая экасістэма з рэдкімі відамі раслін і птушак. Цяпер сядзіба стала развітым турыстычным цэнтрам. І атрымліваецца: стануць турысты на гары — і што яны ўбачаць? Шэрыя панэльныя дамы? — абураюцца жыхары.

Яны кажуць, што за іх дамамі захаваліся пасадкі калекцыйнага бэзу і фундука, розных форм арабіны. Расліны вырубяць, як калісьці вырубілі шыкоўную алею з 20-метровых ліп. Апроч таго, для лошыцкага музейнага комплексу былі распрацаваны рэгламенты забудовы тэрыторыі, якія, па меркаванні жыхароў, ужо парушаюцца.

— Калі была прэзентацыя праекта ў Ленінскім раёне, распрацоўшчык Галіна Перліна сказала, што для гэтага раёна прапануюць высакашчыльную шматпавярховую забудову. Гэты тэрмін прадугледжвае пэўны дыяпазон па павярховасці і колькасці людзей на гектар. Распрацоўшчык сказала, што «мы прапануем усё гэта зрабіць па ніжняй мяжы». Але ж вы разумееце: калі ёсць рэгламент, які прадугледжвае як ніжнюю мяжу, так і верхнюю, то, калі знойдзецца інвестар, ён будзе забудоўваць па верхняй мяжы. Таму гэта ўсё — гульня слоў, — мяркуе Любоў Аркадзьеўна.

Ушчыльненне ўзмоцніць і так вострае пытанне з дзіцячымі садкамі ў Лошыцы, узнікне і праблема з паркоўкамі.

— Каля ракі знаходзіцца водаахоўная зона. І калі ў пачатку Лошыцы яна дасягае двух кіламетраў, то на нашай тэрыторыі звужаецца да 200 метраў, а далей плануюцца дзве шасэйныя дарогі і жылы мікрараён. А што гэта такое? Зімой — соль, змяненне напрамку вятроў і парушэнне водна-зялёнага дыяметра, хімічнае забруджванне. Тут нічога не застанецца, ніякіх рэдкіх відаў.

Жыхары пакінулі свае заўвагі праекціроўшчыкам і ў тым ліку пацікавіліся, ці прайшоў праект экалагічную экспертызу. Цяпер яны рыхтуюць лісты ў Мінпрыроды.

— Чаму за кошт адных трэба будаваць жыллё для іншых? І для каго яны будуюць, дзе рэальна тыя гараджане? Чым больш будуюць, тым больш людзей з абласцей прыязджае і хоча тут пасяліцца, а там усё чахне, — задаюцца пытаннямі суразмоўцы.

На прысядзібных участках тут вырошчваюць магноліі, абрыкосы, грэцкія арэхі — такія віды раслін сустрэнеш не ў кожным батанічным садзе.

Дом, у якім жыве Таццяна Раманавец, унучка члена-карэспандэнта НАН Амбросава, 13-ты біёлаг у сям'і, у 1998 годзе перажыў пажар. Ратавалі сям'ю і рэчы ўсёй вуліцай — тут сапраўды асаблівая атмасфера і адносіны паміж суседзямі, якія ў шматкватэрных дамах рэдка сустрэнеш. Будынак давялося рэканструяваць, і суседзі таксама дапамагалі мяняць дах, рамантаваць пакоі. Седзячы ў прасторнай Таццянінай кухні, з сумам думаеш пра сваю «сяміметроўку» і здзіўляешся, як абноўленаму, адрамантаванаму дому маглі паставіць «кляймо» — больш за 50% зносу. Такую выснову зрабілі супрацоўніцы БТІ, якія пяць гадоў таму візуальна ацэньвалі стан дамоў, прычым у жыллё Таццяны, па яе словах, нават не зайшлі.

Людзі гавораць, што ўклалі ў свае дамы столькі маральных, фізічных і матэрыяльных сіл і сродкаў, што іх не пакрые ніякая кампенсацыя. Перасяленне з дома ў кватэру яны лічаць не паляпшэннем жыллёвых умоў, а якраз наадварот.

— Гэта тое ж, што ты нарадзіў дзіця, а ў цябе яго хочуць забраць. Паклаў на гэта маладыя гады жыцця, і ў мяне ўжо не хопіць здароўя наноў уладкоўваць жыллё, — лічыць Генадзь Усціновіч, які, нягледзячы на пагрозу зносу, працягвае добраўпарадкоўваць свой дом...

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

Афіцыйна

— На сёння гэтыя дамы страцілі сваю каштоўнасць у плане гісторыі, паколькі кожны з іх зменены: былі выкананы надбудовы, прыбудовы. Таму і Мінкульт падтрымаў, што гэтая вуліца пойдзе пад знос, — сказала падчас грамадскага абмеркавання праекта ў Ленінскім раёне **галоўны архітэктар праектаў прадпрыемства «Мінскпраект» Галіна ПЕРЛІНА.** — Менавіта сёння, калі ёсць указ Прэзідэнта аб вынасе аэрапорта Мінск-1 за межы сталіцы і засваенні зямлі пад «Мінск-Мір», гэтая тэрыторыя набывае зусім іншую якасць, таму што доўгія гады тут немагчыма было наогул нічога будаваць. У сувязі з тым, што і развіццё генплана ў асноўным тычыцца развіцця горада ўнутры кальцавой, і тэрыторый для будаўніцтва жылля стала мала, перад намі была пастаўлена задача аб зносе сядзібнай забудовы з максімальнай інтэнсіўнасцю выкарыстання дадзенай тэрыторыі. Сёння гэтая сядзібная забудова — 3,5 тысячы квадратных метраў жылля, а пабудаваць мы зможам 35 тысяч. Таму мы вымушаны былі прыняць такое рашэнне.

Тое, што дамы «вёскі навукоўцаў» падлягаюць зносу, падчас нядаўняй прамой тэлефоннай лініі пацвердзіў і **першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Валерый ВАРАНІЦКІ.** Ён звярнуў увагу, што раней гэтыя 13 дамоў па завулку Лошыцкім і вуліцы Юбілейнай прадугледжвалася захаваць, але паколькі гісторыка-культурнай каштоўнасці яны ўжо не ўяўляюць, то на гэтай тэрыторыі пабудуюць дарогу, правядуць падземныя камунікацыі і ўзвядуць шматкватэрныя дамы.

Прыкладна так першапачаткова выглядалі ўсе будынкі па Лошыцкім завулку.

■ Памяць

УЗГАДВАЮЧЫ САВЕЦКАГА ХЕМІНГУЭЯ

У Магілёве сустрэліся прыхільнікі творчасці Канстанціна Сіманава

«Сіманаўскія чытанні» становяцца ўсё больш папулярнымі сярод творчай моладзі. У будучых празаікаў і паэтаў ёсць добрая магчымасць заявіць пра сябе падчас міжнароднага конкурсу, які праводзіцца ў рамках гэтага мерапрыемства. Сёлета ён быў прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння пісьменніка і 70-годдзю Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Удзел у ім прынялі паўтысячы чалавек з ліку вопытных і пачынаючых літаратараў далёкага і блізкага замежжа. Асабліва прыемна, што ў якасці падарункаў найлепшым выкарыстоўваліся кнігі і часопісы выдавецкага дома «Звязда».

Сярод пераможцаў літаратурнага конкурсу шмат моладзі.

— Мы атрымалі шмат дыхтоўных, годных работ. Уладальнікамі дыпломаў 1-й, 2-й і 3-й ступені сталі адразу па некалькі чалавек, — падкрэсліў **старшыня Смаленскай абласной арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі Алег ДАРАГАНЬ, які ўзначаліў журы гэтага конкурсу.**

Смаленск і Магілёў моцна звязаны творчасцю пісьменніка. На легендарным Буйніцкім полі Сіманаў убачыў герояў свайго будучага рамана «Жывыя і мёртвыя», а ў Смаленску напісаў знакамітыя радкі: «Ты помнишь, Алёша, дороги Смоленщины...» «Па завяшчанні пісьменніка, яго прах быў развеяны над Буйніцкім полем. У эпоху ўсеагульнага атэізму ён паказаў гэтым сваё яднанне з тымі, хто загінуў, абараняючы радзіму, каго ён увекавечыў у сваіх раманах і вершах, — адзначыў Алег Дарагань. — Сіманаў адкрыў тэму экзістэнцыялізму ў літаратуры, выразна паказаў сутнасць чалавека, які знаходзіцца паміж жыццём і смерцю на полі бою. Пра гэта ён псіхалагічна тонка піша ў сваіх творах. Нездарма яго называюць савецкім Хемінгуэем».

Круглы стол, сустрэчы з пісьменнікамі, ветэранамі, краязнаўцамі, якія звычайна праходзяць у рамках «Сіманаўскіх чытанняў», даюць добрую магчымасць удзельнікам падзяліцца творчымі здабыткамі, знайсці адказ на хвалюючыя пытанні.

— На такіх сустрэчах мы звяраем гадзіннікі, аналізуем, наколькі пісьменнікі гатовы супрацоўнічаць адзін з адным, адстойваць праўду гісторыі і пісаць новыя творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, — кажа **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** — Тыя, хто лічыць, што тэма вычарпана, глыбока памыляюцца. Конкурсы, прысвечаныя Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, паказваюць, што вялікая колькасць моладзі з задавальненнем піша на гэтую тэму. Мы трымаем пераможцаў гэтых конкурсаў пад увагай, дапамагаем ім развіваць талент, выдаём іх першыя кнігі.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*
Фота аўтара

■ На варце смаку

У ДЭГУСТАТАРАЎ «САЛОДКАЕ ЖЫЦЦЁ»?

Карэспандэнты «Звязды» высвятлялі гэта на ўласным досведзе

Кожны ласунак «здае экзамен» на знешні выгляд, колер, кансістэнцыю, пах, смак.

Як спалучаюцца салёныя агуркі і цукеркі, колькі салодкага можа з'есці чалавек за раз, і чаму дэгустатары лічаць сябе капрызнымі спажыўцамі, даведаліся карэспандэнты «Звязды», наведаўшы навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па харчаванні.

Пра смак, пах, колер і вопыт

— Узор №5 вельмі прыліпае да абгорткі. Яго на сонцы трымалі? — пытаецца адзін з членаў дэгустацыйнай камісіі.

У адказ чуецца цвёрдае «не». Як вынік — пункт ацэнкі «Структура» узор №5 не прайшоў. Але гэта яшчэ толькі пачатак. Кожны ласунак «здае экзамен» на знешні выгляд, колер, кансістэнцыю, пах, смак. «Выдатнікі» без лішніх пытанняў атрымліваюць права трапіць на прылаўкі крам, а вось тыя, хто экзамен «заваліў», адпраўляюцца на дапрацоўку з улікам заўваг Цэнтральнай дэгустацыйнай камісіі і потым паўторна вяртаюцца на дэгустацыю. На гэты раз было чатыры такія «пераздачы». Прахадны бал для новых відаў прадукцыі — 3,5, для тавараў, якія выпускаюцца серыйна, — 3,0.

— Прабачце, калі ласка, а чым, напрыклад, па колеры адрозніваюцца вось гэтыя дзве абсалютна аднолькавыя пліткі шакаладу? — шэптам пытаюся я ў «калегі» па дэгустацыйным стале.

— Узор №13 ад «Камунаркі» — сапраўдны горкі шакалад. Ён мае цёмны колер, бліскучы пярэдні бок, выразныя грані, аднародную структуру і маналітнасць у зломе. Узор №14 ад «Спартака», як вы бачыце, не такі, — хутка адказала жанчына.

Шчыра кажучы, гэтага я не бачыла. Як па мне, звычайны шакалад. Галоўнае, што не зялёнага колеру.

— Вопыту ў вас няма, — быццам суцяшаючы, кажа мая суразмоўца. — З першага разу прафесіяналамі не становяцца.

Аднак, як высветлілася, акрамя вопыту, патрэбен талент (дакладней схільнасць) і, вядома ж, навыкі!

— У Беларусі няма ўстаноў, дзе рыхтуюць спецыялістаў такога профілю, таму супрацоўнікі нашага цэнтра і галоўныя тэхнолагі буйных кандытарскіх прадпрыемстваў («Камунаркі», «Спартака», «Слодыча», «Віцьбы» і іншых) праходзяць курсы па агульных прынцыпах сэнсарнага аналізу, — тлумачыць **Ала ШАЎЧУК, сакратар ЦДК, кіраўнік групы па кандытарскай галіне аддзела тэхналогій кандытарскай і маслатлушчавай прадукцыі Навукова-практычнага цэнтра НАН па харчаванні.**

Спецыялісты кажуць, што вывучыць тэорыю па падручніках — справа трох дзён. Поўнае апісанне працэсу дэгустацыі шмат часу не займае. А вось адрозніваць смак, пах, водар вучацца ўсё жыццё.

Пра тэмпературу, святло і... салёныя агуркі

— Вы, я спадзяюся, не моцна надушыліся? — раптам пытаецца Ала Шаўчук.

— Звычайна, — не разумеючы пытання, адказваю я.

— На дэгустацыі лішнія пахі не патрэбны. Моцны парфюм толькі ўскладняе нашу працу.

Каштаваць кандытарскія вырабы нас з фотакарэспандэнтам запрасілі к 11 гадзінам. І гэта нездарма. Дзесьці за гадзіну да пачатку «працэсу» трэба даць рэцэптарам адпачыць: не курыць, не есці вострых страў, не піць моцнай кавы. А апоўдні так і атрымліваецца, што ты не хвіліну назад паснедаў, але яшчэ не галодны, ужо не сонны, але яшчэ і не стаміўся.

У дэгустацыйным пакоі павінна быць светла і цёпла. У ідэале — дзённае святло. Тэмпература — ад 17 да 23 градусаў. Мае значэнне і зручная пастава спецыяліста. У Цэнтральную дэгустацыйную камісію ўваходзіць каля дваццаці пяці чалавек.

— І дзе тут фундук? — пытаецца старшыня камісіі, паказваючы на ўзор №6 «Цукеркі шакаладныя крэм + здробнены фундук».

Не адчуць смаку фундука змагла і я. Але на гэтым мае поспехі ў гэтай нялёгкай, як высветлілася, справе скончыліся. Даць ацэнку паху ласункаў — місія невыканальная. Усё тут дужа апетытна, і гэта нягледзячы на тое, што салодкае я не вельмі люблю.

Наша Каця спрабуе разабрацца ў тонкасцях незвычайнай прафесіі дэгустатара.

— Я ледзь адолела тры цукеркі, зефір і печыва! Як вам удаецца не проста столькі каштаваць салодкага, а раскладваць прадукт на «добра» і «дрэнна»? — пытаюся ў Алы Адольфаўны.

У складзе дэгустацыйнай камісіі кандытарскіх вырабаў толькі адзін мужчына. Спецыялісты кажуць, што гэта проста супадзенне, без ніякіх падводных камянёў.

— Ва ўсіх свая праца, — усміхаючыся, кажа мая суразмоўца. — Увогуле, на адным пасяджэнні камісіі рэкамендуецца каштаваць не больш за 25 узораў кандытарскіх вырабаў. Калі даводзіцца дэгуставаць больш, то члены камісіі павінны перарывацца на паўзу.

Каб хоць трохі нейтралізаваць смакавыя адчуванні пасля пробы апошняга ўзору ўсходніх ласункаў, па парадзе «калег» адкусваю адзін з салёных агуркоў, якія таксама знаходзяцца на стале дэгустатараў кандытарскіх вырабаў. Кампанію ім складаюць аліўкі, лімоны, апельсіны, яблыкі, несалодкая гарбата. Гэта, як той казаў, цуду асаблівага не зробіць, але не зблытаць ноткі смаку павінна дапамагчы.

— Навошта чарнавік? — пытаюся я ў «калегі», якая робіць пазнакі на звычайнай белай паперы.

— Кожнае выпраўленне ў дэгустацыйным лісце адзнакі арганалептычных характарыстык кандытарскай прадукцыі не вельмі, мякка кажучы, вітаецца плюс пацвярджаецца асабістым подпісам. Таму лепш сябе падстрахаваць. Напрыклад, паспяшаўся, паставіў адну адзнаку, а праз пяць секундаў зразумеў, што ласунак заслугоўвае вышэйшага бала, — дзеліцца член камісіі.

Пра мужчын, дзяцей і быт

Мы з фотакарэспандэнтам трапілі на адкрытую дэгустацыю, гэта значыць, у дэгустацыйных лістах указваліся найменні ўзораў і іх вытворцы. Узоры «засакрэчваюцца» толькі ў тым выпадку, калі ўзнікаюць рознагалоссі па пытаннях якасці прадукцыі.

Дэгустацыйны працэс.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

Што тычыцца закрытай дэгустацыі, то тут пазначаюцца шыфры ўзораў, а членам камісіі агучваецца толькі група прадукцыі (напрыклад, вафлі, карамель, печыва). Падчас закрытай дэгустацыі членам камісіі забаронена размаўляць, абменьвацца меркаваннямі адно з адным.

— А ці не спрабавалі вы запрашаць ацэньваць кандытарскія вырабы «галоўных экспертаў» салодкага — дзяцей? — пытаюся я ў Алы Шаўчук.

— Не, такога вопыту не было. Высновы атрымаюцца непрафесійнымі, кшталту «падабаецца» ці «не падабаецца», — кажа сакратар ЦДК.

Прафесійныя навыкі дэгустатара запатрабаваны і ў побыце. Як кажуць самі спецыялісты, яны досыць капрызныя спажыўцы — заўважаюць тое, што не бачыць звычайны чалавек.

Цікава, што ў складзе дэгустацыйнай камісіі кандытарскіх вырабаў толькі адзін мужчына. Спецыялісты кажуць, што гэта проста супадзенне, ніякіх падводных камянёў тут няма. Працаваць у гэтай вобласці могуць як жанчыны, так і прадстаўнікі моцнай паловы.

Прафесійныя навыкі дэгустатара запатрабаваны і ў побыце. Напрыклад, каб выбраць у краме якасны свежы зефір, асабліва калі купляеш яго ў якасці падарунка. Як кажуць самі спецыялісты, яны досыць капрызныя спажыўцы. Ім удаецца заўважыць тое, што не бачыць звычайны чалавек.

Часцей за ўсё дэгустацыя працягваецца каля трох гадзін. Мне і фотакарэспандэнту хапіла хвілін трыццаць, каб зразумець, што не такое ўжо салодкае жыццё ў дэгустатараў кандытарскіх вырабаў. Гэтая праца патрабуе не проста ўважлівасці, засяроджанасці, добрага нюху і смакавай адчувальнасці, але таксама і здольнасці з'есці каля трыццаці ўзораў цукерак, незалежна ад таго, ці хочацца вам сёння салодкага...

Кацярына АСМЫКОВІЧ